# РАЗВИТИЕ ОБРАЗОВАНИЯ И КУЛЬТУРЫ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

**В.І.ГАЛУБОВІЧ**

## *З ГІСТОРЫІ ВЫКЛАДАННЯ ЭКАНАМІЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII–XIX СТСТ.*

Упершыню на Беларусі выкладанне эканамічных дысцыплін пачалося ў Віленскім універсітэце, які быў заснаваны ў 1579 г. Ён адыграў вялікую ролю ў гісторыі развіцця беларускага, літоўскага, польскага і украінскага народаў, прадстаўнікі якіх тут навучаліся. Выкладчыкамі ва універсітэце працавалі выхадцы з краін Цэнтральнай і Заходняй Еўропы.

Гісторыя Віленскага універсітэта налічвае больш чатырох стагоддзяў, яна заўсёды была цесна звязана з эканамічным і палітычным развіццём беларускага народа.

Нагадаем, што час заснавання Віленскага універсітэта беларускія землі ўваходзілі ў склад беларуска-літоўскай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і іншых зямель, дзе тэрыторыя этнаграфічнай Літвы займала толькі шостую частку, с карэннага насельніцтва налічвалася менш адной трэці. Астатнія землі былі беларускія, украінскія і рускія.

У XVI ст. у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе Ватыкан узмацiў барацьбу з ідэямі рэфармацыі каталіцтва, якія ўжо атрымалі перамогу ў некаторых краінах Заходняй Еўропы, у тым ліку і ў суседняй Прусіі. Ідэі рэфармацыі каталіцкай рэлігіі пранікалі і на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага, а гэта вельмі непакоіла каталіцкі касцёл. У 1568 г. віленскі епіскап Валерыян Пратасевіч запрасіў у Вялікае княства Літоўскае іезуітаў – "воінаў Хрыста", як яны самі сябе называлі. Ордэн іезуітаў быў ваеннай арганізацыяй каталіцкай царквы, авангардам каталіцкай рэакцыі. Начале яго стаяў генерал, а ўпраўленне ажыццяўлялася з Ватыкану.

У выніку Люблінскай уніі ў 1569 г. была ўтворана Рэч Паспалітая – федэратыўная дзяржава беларускага, польскага, літоўскага, украінскага, рускага і іншых народаў, у склад якой увайшло Вялікае княства Літоўскае. Тэрыторыя Польшчы займала ў гэтай дзяржаве толькі трэцюю частку.

Іезуіты з дапамогай каталіцкай царквы хутка ўкараніліся ў палітычную сферу Рэчы Паспалітай. Менавіта ордэн іезуітаў дабіўся поўнай

---

*Валерый Іванавіч ГАЛУБОВІЧ, кандыдат эканамічных навук, прафесар, загадчык кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ.*

манаполіі ў галіне адукацыі. У 1577 г. быў выдадзены ўказ, які забараніў адкрываць любыя школы без дазволу віленскага епіскапа ці самога караля (1. Ст. 3–4).

1 красавіка 1579 г. Вялікі князь Літоўскі і кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый выдаў спецыяльны акт – прывілей аб адкрыцці Віленскага універсітэта (2. Ст. 12). Яго адкрыццё было абумоўлена патрэбамі эканамічнага і палітычнага развіцця Вялікага княства Літоўскага, якое і ў межах Рэчы Паспалітай карысталася значнай аўтаноміяй, а таксама імкненнем супакоіць беларуска-літоўскіх магнатаў і шляхту, вельмі незадаволеных Люблінскай уніяй 1569 г. У далейшым каталіцкі касцёл і ордэн іезуітаў выкарыстоўвалі Віленскі універсітэт як сродак у барацьбе з рэфармацыяй і для акаталічвання беларускага, украінскага і літоўскага народаў. Віленскі універсітэт карыстаўся правамі экстэрытэрыяльнасці, падпарадкоўваўся толькі аднаму ордэну іезуітаў, і ніякай іншай свецкай або духоўнай інстанцыі ён быў непадуладны.

У першыя гады існавання Віленскага універсітэта эканамічныя дысцыпліны ў ім не выкладаліся, існавалі толькі два факультэты – філасофскі і тэалагічны. Гэта і не дзіўна, бо ў сярэдневеччы адукацыя ў Еўропе была манаполіяй духавенства, мела пераважна багаслоўскі характар. У далейшым былі адкрыты яшчэ два факультэты – юрыдычны і медыцынскі.

Але, нягледзячы на рэакцыйную палітыку іезуітаў, ва універсітэце з'яўляюцца значныя для таго часу навуковыя працы, у якіх з прагрэсіўных пазіцый разглядаліся эканамічныя працэсы феадальнага грамадства. Найбольш важным з такіх твораў неабходна лічыць кнігу М.Сміглецкага пад назвай "Аб ліхвярных працэнтах" ("О ростовщических процентах"), якая выйшла ў свет у 1596 г. Яна была напісана не на лацінскай, а на польскай мове, таму і стала вядома шырокаму колу чытачоў. Аўтар лічыў прыгонніцтва перажыткам рабства і адстойваў ідэю, што – у адпаведнасці з хрысціянскімі каштоўнасцямі – сялянскай гаспадарцы павінна быць нададзена больш эканамічных свабод (3. Ст. 37).

У сярэдзіне XVII ст. эканамічныя і грамадска-палітычныя адносіны ў феадальным грамадстве найбольш дакладна аналізаваў прафесар права юрыдычнага факультэта А.Алізарэўскі. У 1651 г. ён выдаў у Данцыгу сваю галоўную працу – "Аб палітычнай супольнасці людзей", дзе выступаў супраць феадальных эканамічных адносін, крытыкаваў прыгонніцкі лад, выступаў за свабоду развіцця рамеснай дзейнасці, якую абмяжоўвалі цэхавыя статуты і правілы. Аўтар падкрэсліваў, што войны, прыгонніцтва, прымусы, насілле адмоўна ўплываюць на эканамічную дзейнасць людзей. Такія ідэі А.Алізарэўскага выхоўвалі ў чытача і студэнта крытычная адносіны да феадальнага ладу, расчышчалі глебу для ўкаранення новых эканамічных поглядаў і ідэй. Гэты твор А.Алізарэўскага быў выдадзены на польскай мове ў Варшаве ў 1931 г.

Відавочна, што марнымі былі ўсе намаганні іезуітаў па знішчэнню ва універсітэце ўсялякіх прагрэсіўных думак, бо яны прарываліся ў друкаваных выданнях і ў лекцыях і станоўча ўплывалі на студэнтаў, якія пасля заканчэння універсітэта самі пачалі выступаць супраць каталіцтва і сваіх былых настаўнікаў-іезуітаў. Сведкай гэтаму з'яўляецца выхаванец Віленскага універсітэта, выдатны беларускі асветнік Мялецій Сматрыцкі (к. 1578–1633 гг.) – аўтар шырока вядомай "Граматыкі славенскай...".

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г., калі да Расійскай імперыі адыйшла усходняя Беларусь, быў забаронены ордэн іезуітаў. Была праведзена рэарганізацыя універсітэта спецыяльна створанай адукацыйнай камісіяй.

Развіццё капіталістычных адносін у Рэчы Паспалітай і ў яго састаўной частцы Вялікім княстве Літоўскім уладна патрабавала хутчэйшага ўкаранення ва ўсе галіны жыцця навейшых навуковых ведаў.

Крызіс на Беларусі феадальнай сістэмы гаспадарання, фарміраванне ў яе нетрах таварна-грашовых адносін патрабавалі тэарэтычнага абагульнення гэтага працэсу, выпрацоўкі прымальных для феадальнага грамадства адказаў на пытанні, якія ўладна ставіла жыццё. Найбольш падыходзячымі для гэтага былі такія вучэбныя дысцыпліны, як "прыроднае" ("естественное") права і палітычная эканомія, перш за ўсё тэорыя фізіякратаў, якая па сутнасці была "першай сістэматычнай канцэпцыяй капіталістычнай вытворчасці" (3. Ст. 405).

Найбольш істотнай зменай у ходзе рэарганізацыі Віленскага універсітэта стаў пачатак выкладання на Беларусі палітычнай эканоміі. Фактычна курс палітычнай эканоміі пачаў чытацца ўжо ў 1783 г. прафесарам права І.Страйноўскім (1752 – 1815), нягледзячы на тое, што палітычная эканомія як самастойная вучэбная дысцыпліна вылучалася толькі ў 1803 г. У курсах лекцый прафесара І.Страйноўскага пад назвай "прыроднае права" ("естественное право") выкладаўся курс палітычнай эканоміі, а ў падзагалоўку назвы курса лекцый за 1785 – 1789 гг. з'яўляюцца словы "палітычная эканомія" (2. Ст. 54). Сам тэрмін "палітычная эканомія" ўпершыню з'яўляецца ў назве падручніка І.Страйноўскага "Навука права прыроднага, палітычнага, эканомікі палітычнай і права народаў", які выйшаў на польскай мове у Вільні ў 1785 г.

Курс лекцый і падручнік І.Страйноўскага аказвалі вялікі ўплыў на студэнтаў Віленскага універсітэта, бо ў іх крытыкаваўся прыгонніцкі гаспадарчы механізм, феадальныя вытворчыя адносіны, прапагандаваліся ідэі фізіякратаў, капіталістычныя вытворчыя адносіны. Зыходзячы з нормаў так званага "прыроднага права", аўтар разглядаў эканамічныя ўзаемаадносіны паміж грамадствам і ўладай, растлумачваў механізм стварэння грамадскага прадукта і яго размеркавання.

Фактычна І.Страйноўскі ў сваім падручніку абгрунтаваў сістэму новых капіталістычных адносін, іх перавагу перад старымі феадальнымі эканамічнымі адносінамі. Ён выступаў за асабістае распрыгоньванне сялян, але нічога не казаў аб неабходасці надзялення іх зямлёй. Няхай яшчэ нясмелая, але гэта крытыка існуючага гаспадарчага механізму аказвала вялікі ўплыў на студэнтаў Віленскага універсітэта. Большасць яе палажэнняў былі амаль новымі для студэнтаў і, безумоўна, мелі вялікае прагрэсіўнае для таго часу значэнне. З 1793 г. курс палітычнай эканоміі пачаў чытаць пераемнік І.Страйноўскага віце-прафесар С.Малеўскі (1759 – 1832), ураджэнец Беларусі, выхаванец Віленскага універсітэта. Ён выкладаў курс палітычнай эканоміі па падручніку І.Страйноўскага.

4 красавіка 1803 г. выйшаў указ Аляксандра І аб чарговай рэарганізацыі Віленскага універсітэта. Упершыню на Беларусі былі створаны спецыяльныя эканамічныя кафедры. Так, на факультэце фізічных і матэматычных навук побач з кафедрамі фізікі, хіміі, гісторыі прыроды, батанікі, вышэйшай (т.зв. чыстай) матэматыкі, вышэйшай (т.зв. змешана-прыкладной) матэматыкі, астраноміі, грамадзянскай архітэктуры была арганізавана кафедра сельскага дамаводства. На факультэце духоўных і палітычных навук побач з кафедрамі логікі і метафізікі, філасофіі, прыроднага, палітычнага і народнага права, грамадзянскага і крымінальнага права была ўтворана кафедра дзяржаўнай гаспадаркі (4. Ст. 53 – 54).

У хуткім часе была арганізавана і самастойная кафедра палітычнай эканоміі. У 1810 г. загадчыкам гэтай кафедры быў абраны прафесар Я.Зноска (1772 – 1833), які выкладаў курс палітычнай эканоміі да 1832 г. У 1811 г. ён выдае на польскай мове ў Вільні падручнік пад назвай "Навука эканоміі палітычнай згодна ўкладу Адама Сміта ў кароткім змесце". У сваіх лекцыях і падручніку Я.Зноска прытрымліваўся палажэнняў Адама Сміта.

Пасля прафесара Я.Зноскі новым загадчыкам кафедры палітычнай эканоміі стаў Я.Вашкевіч (1797 – 1859), які выкладаў гэту дысцыпліну да

закрыцця універсітэта ў 1830 г. Ён пайшоў значна далей свайго папярэдніка, пашырыў курс палітычнай эканоміі і ўключыў у яго шмат даных па шэрагу галін канкрэтнай эканоміі (фінансаў, гандлю, статыстыкі).

Я.Вашкевіч напісаў і выдаў шэраг навуковых і навукова-метадычных прац, якія былі па сутнасці вучэбнымі дапаможнікамі для студэнтаў. Сярод іх "Навука аб гандлі", якая была выдадзена на польскай мове ў Вільні ў 1830 г., "Гісторыя банкаў і іншых галоўных крэдытных устаноў", якая таксама была выдадзена ў Вільні на польскай мове ў 1836 г. Гэтыя два падручнікі Я.Вашкевіча па канкрэтнай эканоміцы паступова замацоўваліся ў самастойныя вучэбныя курсы і толькі закрыццё Віленскага універсітэта перашкодзіла завяршэнню гэтага працэсу (2. Ст. 80).

Яшчэ адной важнай эканамічнай дысцыплінай, якая пачала выкладацца на Беларусі ў Віленскім універсітэце, была эканоміка сельскай гаспадаркі. Яшчэ з 70-х гг. XVIII ст. да гэтай дысцыпліны прабуджаўся вялікі інтарэс, але вучэбнай дысцыпліны яна стала толькі ў 1819 г. Праўда, у 1803 г. на факультэце фізічных і матэматычных навук была арганізавана кафедра сельскага дамаводства, але ў асноўным гэта была кафедра аграноміі.

Заснавальнікам новай эканамічнай дысцыпліны — эканомікі сельскай гаспадаркі — стаў выпускнік Віленскага універсітэта беларус Міхал Ачапоўскі. Ён быў рода са Слуцку, у 1811 г. скончыў факультэт духоўных і палітычных навук Віленскага універсітэта. Прафесар М.Ачапоўскі большую частку сваіх лекцый прысвячаў арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, паказваў абмежаванасць тэорый меркантылістаў і фізіякратаў. Шмат увагі ён надаваў аналізу становішча ў сельскай гаспадарцы Беларусі і Літвы, паказваў нізкую прадукцыйнасць працы прыгонных сялян, падкрэсліваў неабходнасць распаўсюджвання навуковых ведаў. М.Ачапоўскі прыкладаў вялікія намаганні па стварэнню ва універсітэце вопытнай гаспадаркі, дзе было б магчыма весці практычнае навучанне студэнтаў. Але стварыць такую гаспадарку да закрыцця універсітэта так і не ўдалося.1 мая 1832 г. загадам Мікалая I Віленскі універсітэт быў закрыты. На яго базе была адкрыта Віленская медыка-хірургічная акадэмія і духоўнае вучылішча, якое потым стала акадэміяй і было пераведзена ў Пецярбург. Шэраг кафедр, у тым ліку эканамічнага профілю, былі пераведзены ў Кіеўскі універсітэт імя св.Уладзіміра.

Пасля ўтварэння ў лютым 1919 г. адзінай Літоўска-беларускай савецкай сацыялістычнай рэспублікі 13 сакавіка 1919 г. СНК Л-БССР прыняў дэкрэт аб адкрыцці універсітэта працы ў Вільні. А ў 1921 г. у Мінску быў адкрыты Беларускі дзяржаўны універсітэт, дзе на факультэце грамадскіх навук пачалася падрыхтоўка ўласных эканамістаў вышэйшай адукацыі.

Такім чынам, гісторыя эканамічнай адукацыі на Беларусі налічвае ўжо больш двух стагоддзяў. Аднак трэба шчыра прызнацца, што пытанне аб пачатку распаўсюджвання на Беларусі эканамічных ведаў яшчэ чакае свайго даследчыка. Шэраг навукоўцаў лічаць, што ў існаваўшых на Беларусі ў XVI—XVII стст. навучальных установах пры розных рэлігійных ордэнах таксама выкладаліся тыя ці іншыя эканамічныя навукі. Але гэтыя погляды неабходна пацвердзіць архіўнымі матэрыяламі.

### Некалькі слоў аб арганізацыі навучання і быту студэнтаў Віленскага універсітэта

Ужо праз два гады пасля адкрыцця Віленскага універсітэта быў абсталяваны невялікі інтэрнат для студэнтаў, які ў той час называўся "бурсай" (з латыні — "кішэня, кашалёк") — як бы агульная каса для студэнтаў. Потым з дазволу генерала ордэна іезуітаў быў пабудаваны больш вялікі інтэрнат, які ўжо называўся "канвікт".

Фінансавыя сродкі Віленскага універсітэта ў асноўным складалі даходы з маёнткаў, якія былі падараваны універсітэту магнатамі Вялікага княства літоўскага. У сярэдзіне XVII ст. універсітэту належылі толькі буйных 11 маёнткаў, 20 тыс. гектараў зямлі і некалькі тысяч прыгонных сялян. Акрамя таго, шмат феадалаў ахвяравалі грошы на ўтрыманне асобных кафедраў, студэнцкага інтэрната. У 1761 г. сродкі універсітэта складалі вялікую для таго часу суму — 50 тыс.польскіх злотых. Грошы былі немалыя, але кіраўніцтва універсітэта ўвесь час скардзілася на іх недахоп.

Лекцыі былі асноўным відам вучэбных заняткаў. Падручнікаў было мала, а па некаторых курсах яны амаль цоўнасцю адсутнічалі, таму канспекты лекцый студэнты пісалі пад дыктоўку і поўнасцю іх завучвалі. Заняткі пачыналіся ў 7 гадзін раніцы і працягваліся да 15 гадзін. Пасля 15 гадзін — паўтор праслуханых лекцый. Лекцыі адбываліся і па нядзелях. Працоўны дзень студэнтаў працягваўся 13 гадзін з перапынкамі на снеданне, абед і вячэру. Шмат часу надавалася малітвам, абавязковымі лічыліся танцы. Пасля вячэры — арганізаваная прагулка. Адыход да сна — паміж 22-й і 23-й гадзінамі вечара. Пад'ём — у 6 гадзін раніцы.

Акрамя лекцый былі і дыспуты, якія праводзіліся, як правіла, па суботах. Два разы ў год — экзамены. Заключнай формай праверкі ведаў была т.зв. "абарона тэзісаў", па-сучаснаму абарона дыплома.

У 1586 г. ва універсітэце было 700 студэнтаў, а ў 1803 г. — каля 300. На лекцыях дазвалялі прысутнічаць курсантам кадзецкага вучылішча і афіцэрам. У цэлым на момант закрыцця Віленскага універсітэта каля 80 % студэнтаў былі ўраджэнцы Беларусі. Ураджэнцаў этнаграфічнай Літвы, якія называлі сябе "жамойцічамі", было вельмі і вельмі мала (2. ст. 89). Усяго ў 1831 г. студэнтаў налічвалася 1831 чалавек, у той час як у Маскоўскі універсітэце толькі 734 (2. Ст. 89). Большасць студэнтаў былі т.зв. "своекоштныя", але частка ўтрымлівалася за казённы кошт.

**М.І.БАЖКОВА**

# *АБ ФАРМІРАВАННІ І РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЭКАНАМІЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ*

Вырашэнне важнейшых народна-гаспадарчых задач патрабуе актывізацыі эканамічных навук, што немагчыма без такога дасканалага інструмента пазнання, якім з'яўляецца тэрміналогія. Узнікненне і станаўленне сістэмы палітэканамічнай тэрміналогіі — адна з праяў развіцця палітэканоміі як навукі.

Развіццё беларускай палітэканамічнай тэрміналогіі абумоўлена як грамадска-эканамічнымі, так і моўнымі фактарамі. Беларуская палітэканамічная тэрміналогія развіваецца ў цеснай узаемасувязі з развіццём іншых нацыянальных тэрміналогій, перш за ўсё рускай і ўкраінскай.

Фарміраванне і развіццё беларускай палітэканамічнай тэрміналогіі адбывалася ў рэчышчы агульнага развіцця і ўдасканалення лексічнага складу

*Марына Іванаўна БАЖКОВА, выкладчык кафедры беларускай і рускай моў БДЭУ.*